# БІТВА ЗА ГОМЕЛЬ

БІТВА за Гомель, адкуль пачалося вызваленне Беларусі, выдатны ПОДЗВІГ нашай арміі і народных мсціўцаў у нялёгкім адзінаборстве з выкармленымі міжнародным імперыялізмам фашысцкімі захопнікамі. У ёй, як і ва ўсёй Вялікай Айчыннай вайне, ярка праявілася кіруючая роля Камуністычнай партыі, жыццяздольнасць і моц сацыялістычнага грамадскага і дзяржаў-нага ладу, непарушнае адзінства і дружба народаў нашай шматнацыянальнай краіны, вернасць савецкіх людзей ідэям марксізму-ленінізму, іх беззапаветная адданасць сацыялістычнай Радзіме.

Гэтая бітва пачалася з першых месяцаў вайны. Я не буду расказваць аб 50-дзённай абароне Гомеля ў спякотныя дні ліпеня-жніўня 1941 года, якая так ашаламіла нямецка-фашысцкіх захопнікаў, што гітлераўскаму камандаванню давялося тэрмінова ўносіць сур'ёзныя папраўкі ў свае планы «маланкавай вайны». Спынюся непасрэдна на вызваленні Гомеля, дзе савецкія воіны і партызаны ў грозныя і суровыя асеннія дні 1943 года нанеслі нямецка-фашысцкім захопнікам першае буйное паражэнне ў Беларусі.

Атрымаушы перамогу над ворагам на Курскай дузе, пад Арлом, Белгарадам, Харкавам і Бранскам, савецкія войскі разгарнулі магутнае стратэгічнае наступленне на шырокім фронце ад Вялікіх Лук да Азоўскага мора. У цэнтры ўсіх франтоў, не даючы гітлераўдам перадышкі, на гомельска-бабруйскім напрамку наступаў праслаўлены Цэнтральны фронт (перайменаваны 20 кастрычніка 1943 года ў Беларускі) пад Камандаваннем праслаўленага савецкага палкаводца генерала арміі Канстанціна Канстанцінавіча Ракасоўскага.

Гітлераўскае камандаванне спрабавала ў што б там ні стала спыніць рух войск фронту на захад. Вораг разгарнуў велізарныя па сваіх маштабах абарончыя работы на берагах Дзясны, Сожа і асабліва Дняпра.

21 верасня часці 13-й арміі генерал-лейтэнанта Н. П. Пухава на ўчастку Мнева, Чарнобыль, Сташаў падышлі да Дняпра. Выкарыстоуваючы пераправы, захопленыя партызанамі, 8-я і 74-я стралковыя дывізіі 15-га стралко-вага корпуса пад камандаваннем палкоўніка П. М. Грудзя і генерал-маёра А. А. Казарана на світанні 22 верасня пачалі фарсіраванне ракі. Выключную мужнасдь, гераізм і рашучасць пры фарсіраванні Дняпра праявілі байцы і камандзіры 360-га стралковага палка 74-й стралковай дывізіі на чале са сваім камандзірам падпалкоўнікам М. І. Сташэкам. Іх дзеянні дазволілі на працягу дня ўсім палкам дывізіі і суседзям пераправіцца праз Днепр, трывала авалодаць плацдармам, а на наступны дзень разгарнуць наступленне на захад ад ракі.

Да вечара 23 верасня 13-я армія ўжо займала на заходнім беразе Дняпра плацдарм глыбінёй 35 і шырынёй 30-35 кіламетраў. Ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў был! вызвалены Камарын, чыгуначная станцыя Новая Іёлча, вёскі Кіраў, Ст. Іёлча і Чапаеўка Брагінскага раёна — першыя населения пункты на тэрыторыі Гомельшчыны і Беларусі.

У ноч з 21 на 22 верасня да Дняпра падышла 61-я армія генерал-лейтэнанта П. А. Бялова і часткай сіл фарсіравала яго, захапіўшы невялікі плацдарм ля вёскі Ніўкі - Глушэц, што на поўдзень ад Лоева.

65-я армія пад камандаваннем гене-рал-лейтэнанта П. І. Батава, дзейнічаючы ў цэнтры фронту, 25 верасня раніцай фарсіравала раку Сноў і авалодала вёскай Гарадок Добрушскага раёна. У той жа дзень часці арміі вызвалілі яшчэ некалькі населеных пунктаў. Імяніннікамі адчувалі сябе воіны-гамяльчане П. В.

Несцяровіч, Д. Ф. Самусёў, Б. А. Царыкаў і многія, многія іншыя, якім давялося пачуць нямала добрых віншаванняў ад баявых сяброў з пачаткам вызвалення іх роднай беларускай зямлі. За суткі армія прайшла з баямі 25 кіламетраў і авалодала Церахоўкай. Упэўнена рухаючыся ўперад, часці арміі да вечара 28 верасня на ўчастку Сцюдзёная Гута — Шарпілаўка выйшлі на левы бераг ракі Сож і пачалі падрыхтоўку да яго фарсіравання.

Часці 48-й арміі генерал-лейтэнанта П. Л. Раманенкі, ламаючы ўзмацняючаеся супраціўленне праціўніка, наступаючы ў напрамку Гомеля, 29 верасня вызвалілі Ветку, 10 кастрычніка — Добруш і 11 кастрычніка — Нова-Беліцу.

Войску правага крыла фронту — 63-я армія пад камандаваннем генерал-лейтэнанта В. Я. Калпакчы, 3-я армія генерал-лейтэнанта А. В. Гарбатава і 50-я армія генерал-лейтэнанта І. В. Болдзіна наступалі ў напрамку Гомеля, Жлобіна і Бабруйска.

Наступленне на Гомель з фронту магло абысціся дарагой цаной. Каб пазбегнуць вялікіх страт, камандаванне фронту прыняло рашэнне пачаць аперацыю па вызваленню Гомеля на флангах, каб акружыць яго з поўдня і поўначы і разграміць гомельскую групоўку ворага. Пры гэтым галоўны ўдар войск наносіўся на поўдзень ад Гомеля на ўчастку Лоеў – Радуль 65-й арміяй і часцямі 61-й арміі.

Пачаўшаеся 15 кастрычнка наступленне войск 65-й арміі на лоеўскім напрамку прынесла поспех. Нягледзячы на яраснае супраціўленне ворага, які займаў выгадныя пазіцыі на заходнім беразе Дняпра, войскі 65-й арміі паспяхова фарсіравалі раку, 17 кастрычніка авалодалі Лоевам і нястрымна рушылі ўперад.

Баючыся акружэння, гітлераўскае камандаванне вымушана было пачаць адвод сваіх войск за Днепр. Выкарыстаўшы гэга, войскі 48-й арміі грамілі варожыя атрады прыкрыцця і імкліва прасоўваліся наперад. Палепшыла сваё становішча і 61-я армія, перакінуўшы за Днепр асноўныя сілы з усходняга берагу.

Уверaная мне 11-я армія, перададзеная ў састаў фронту з рэзерву Вярхоўнага Галоўнакамандавання, сумесна з 63-й арміяй рыхтавала нанясенне ўдара на поўнач ад Гомеля і ў напрамку на Жлобін.

Самы непасрэдны ўдзел у планаванні Гомельска-Рэчыцкай аперацыі прынялі члены Ваеннага Савета Панамарэнка, Цялегін, начальнік штаба Малінін, камандуючыя родамі войск Казакоў, Арол, Прашлякоў, Максіменка, Анціпенка. Затым задачы адпрацоўваліся з камандуючымі арміямі. Ваенныя Саветы фронту і армій, паліторганы, партыйныя і камсамольскія арганізацыі часцей і падраздзяленняў мабілізоўвалі сілы байцоў і камандзіраў на паспяховае выкананне плана аперацыі, рас-паўсюджвалі баявы вопыт адважных франтавікоў. Немалую дапамогу войскам у паскарэнні перамогі над ворагам аказвалі партызаны і мясцовае насельніцтва.

У 11 гадзін 10 лістапада пасля 40-мінунтнай артылерыйскай падрыхтоўкі і пры падтрымцы 16-й паветранай арміі генерал-лейтэнанта С. І. Рудэнкі, войскі левага крыла фронту накіраваліся ўперад. У першы ж дзень абарона праціўніка была прарвана. На другі дзень у прарыў пайшлі танкавыя і кавалерыйскія карпусы. Узаемадзейнічаючы, яны імкліва рухаліся наперад, знішчаючы варожыя часці, якія прабавалі супраціўляцца на некаторых участках. Пасля таго, як 19-ы стралковы корпус 65-й арміі пад камандаваннем генерал-маёра Д. І. Самарскага ва ўзаемадзеянні з 1-м гвардзейскім Данскім танкавым корпусам у ходзе паспяховага наступлення 14 лістапада захапіў ст.

Дземяхі і перарэзаў чыгунку Рэчыца — Калінкавічы, фронт праціўніка быў разарван, вялікая група нямецка-фашысцкіх войск, якая знаходзілася на правым беразе Дняпра, аказалася пад пагрозай поўнага акружэння.

Развіваючы гэты поспех і вырваўпіыся далёка ўперад, 1-шы гвардэейскі Данскі танкавы і 19-ты стралковы карпусы вызвалілі больш 40 населеных пунктаў і на поўнач ад Дземяхоў злучыліся з Гомельскім партызанскім злучэннем пад камандаваннем генерал-маёра І. П. Кожара. Сустрэча войск і партызан у гэтым раёне выключна спрыяла далейшым сумесным дзеянням. Партызаны надзейна прыкрывалі левы фланг 65-й арміі.

Інтэнсіўныя атакі часцей 11-й і 63-й армій у напрамку на Гомель не давалі магчымасці праціўніку манеўраваць сваімі сіламі. Гэта садзейнічала поспеху паўднёвай і паўночнай ударных груповак фронту. Захоп нашымі войскамі такіх апорных пунктаў, як Хальч, Старое Сяло, Новае Жыццё і іншых, за якія ішла барацьба многія тыдні, і прарыў 22 лістапада варожай абароны на поўнач ад Гомеля, вызваленне хутара Захарэўскі, пасёлка Новы Свет і выхад да чыгункі Гомель-Жлобін і шасэ Гомель-Магілёў набліжалі вызваленне Гомеля.

Адначасова з ударамі на поўнач Гомеля 22 лістапада перайшлі ў наступленне войскі правага крыла фронту — 3-я аірмія генерала А. В. Гарбатава і 50-я армія генерала І. В. Болдзіна ў раёне Прапойска (цяпер Слаўгарад). Прарыў абароны праціўніка ў раёне Прапойска стварыў для фашысцкіх войск пагрозу рэальнага акружэння ў раёне Гомеля.

Удары, наносімыя гітлераўцам на поўнач ад Гомеля, давяршылі барацьбу за Гомель. Раніцай 26 лістапада часц! 217-й Унецкай стралковай дывізіі палкоўніка Н. П. Масонава і 96-й стралковай дывізіі палкоўніка Ф. Г. Булатава, якія дзейнічалі ў саставе ўверанай мне арміі, у адзіным парыве накіраваліся на паўночныя ўскраіны горада. Адначасова з паўднёвага ўсходу ўварваліся ў Гомель 4-я Бежыцкая стралковая дывізія арміі пад камандаваннем палкоўніка Д. Д. Вараб'ёва і 102-я стралковая дывізія 48-й арміі генерал-маёра С. Я. Сянчылы. Праціўнік згубіў буйны вузел абароны «паўднёвы бастыён Беларусі». 822-дзёная акупа-цыя горада закончылася. Гомель быў першыім абласным цэнтрам Беларусі, вызваленым нашымі войскамі, куды пераехалі ЦК КП(б)Б і ўрад Беларускай ССР.

Радзіма высока ацаніла подзвіг салдат, сержантаў і афіцэраў Беларускага фронту. Дзесяткі тысяч чалавек былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. 23 злучэнні і часці ўдастоіліся гандровай назвы — Гомельскіх. У гонар вызвалення горада на Сожы ў сталіцы нашай Радзімы Маскве прагрымелі дваццаць залпаў салюта з 224 гармат.

**І. І. ФЯДЗЮНІНСКІ, генерал арміі, Герой Савецкага Саюза.**